# Але раптам Пушча ўзрывалася

Трэба прызнацца, што мне неверагодна пашчасціла: менавіта пад час майго візіту ў Нацыянальны парк у навуковым аддзеле ішлі працы над уникальным беларускім выданнем пра славуты запаведнік. Да публкацыі рыхтаваўся пераклад з нямецкай мовы манаграф "Мара аб першабытным лесе", прысвечанай гісторыі Пушчы ў ракурсе руска-нямецкі, савецка-нямецкіх стасункаў, — сумесная праца двух даследнікаў Вячеслава Семакова і Валерыя Рыпергера. Кніга сёлета ўжо ўбачыла свет у Германі, і, нарэшце, Нацыянальны парк завяршыў працу над яе перакладам на рускую мову.

Чым жа ўнікальнае гэтае выданне? Інфармацыя, прадстаўленая ў ім, збіралася даследчыкамі цягам некалькіх гадоў. Валерый Рыпергер адшукваў звесткі ў нямецкіх архівах, Вячаслаў Семакоў — вядомы знаўца Пушчы, навукоўца, які прысвяціў не адно выданне славутаму лесу, — у расійскіх і беларускіх. Далей Вячаслаў Васільевіч аб'яднаў назбраны матэрыял, далучыўшы да яго новый, знайдзеныя за апошні час, факты і дакументы.

На жаль, Вячаслаў Семакоў, які шмат гадоў з'яўляўся намеснікам генеральнага дырэктара Нацыянапьнага парку па навуковай працы, сышоў з жыцця некалый месяцаў таму. Але яго праца засталася, і жонка беларускага даследчыка, вядучы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага парку Ганна Дзянгубенка пазнаёміла чытачоў з навуковай спадчынай мужа — матэрыяламі будучай кнігі.

Магчыма, лёс Белавежскай пушчы пад час вайны склаўся б інакш, але сваю ролю ў жыцці лесу сыграў Герман Герынг. Рэйхсмаршал авіяцыі, стваральнік і кіраўнік паветранай гвардыі рэйха "Люфтвафе", заснавальнік тайнай паліцыі гестапа і першых канцэнтрацыйных лагераў, "паклаўшы вока" на запаветныя абшары ў 30-х гадах, марыў зрабіць у Белавежы паказальную паляўнічую гаспадарку. Апантаны паляўнічы, ён хацеў далучыць да тагачаснай тэрыторый Пушчы яшчэ 100 кв. км і на злучаных частках стварылі аптымальныя ўмовы для пражывання мядзведзяў, рысяў, ваўкоў, гпушцоў, зуброў, аленяў, ласёў і нават заняцца адраджэннем першабытных быкоў—тураў. Забягаючы наперад, адзначым, што штосьці з гэтых планаў Герынгу ўдалося ажыццявіць. Але, як сведчыць гісторыя, намеры рэйхсмаршала ажыццяўляліся шляхам гвалту. І задумы "нацыста № 2" вызначылі асабліваю палітыку ў дачыненні да Пушчы. З першых дзен яе акупацыі ў запаведніку былі ўведзены новыя парадкі і жорсткі рэжым аховы тэрыторыі. Аднак перш чым Герынг пачаў ператвараць свае мары ў жыццё, яго салдатам давялося адкрыць для сябе знакаміты лясны масіў з іншага боку: не толькі як унікальны прыродны аб'ект, "смачны кавалачак" для развіцця паляўнічай гаспараркі, але і месца жорсткага супраціўлення, акрэсленае адным з гітлераўцаў як **"Зялёнае пекла"**.

"К" ужо неаднойчы пісала пра тое, як пачыналася вайна на тэрыторыі Савецкага Саюза. Ужо 22 чэрвеня пяхотныя дывізіі вермахта апынуліся перад слынным запаведнікам. За першыя гадзіны вайны ў Пушчы сабраліся ўсе савецкія войскі, якім удалося выжыць. Гэта былі невялікія часткі Чырвонай Арміі — падраздзяленні, якія апынуліся ў акружэнні і вырашылі змагацца да апошняга. Колькасць тых груп — абаронцаў Пушчы значна саступала ў колькасці гітлераўскім сілам, але ж гэта не перашкодзіла акружэнцам ператварыць "зялёны храм" для ворагаў у "зяленае пекла". Захаваліся ўспаміны нямецкіх салдат, якія апісвалі тыя баі ў Белавежскай пушчы як сутыкненне з непадуладнай стыхіяй.

“Гушчар — амаль непраходны. Паваленыя ствалы дрэў, часткова згніўшыя, часткова яшчэ зялёныя, грувашчыліся вышынёй у метр, стваралі хаос, і гэта пужала радавых матарызаванай пяхоты, — узнаўляў абстаноўку тых дзён адзін з акупантаў-гітлераўцаў у сваіх запасах. — Папараць шчыльна ахутвала дрэвы, і святло станавілася рассеяным. Паветра было цяжкім, задушлівым, гнілым, было цяжка дыхаць. З'яўлялася адчуванне, што праціўнік адступіў перад перавагай сілы. Але раптам пекла ўзрывалася”.

Адрэзаныя нямецкімі войскамі ад сваіх, савецкія змагары вялі барацьбу супраць ворага

без надзеі на выжыванне. І тактыка раптоўных нападзенняў у сітуацыі, якая склалася, была натуральнай і дакладнай; на пад'язных дарогах акружэнцы зладжвалі добра замаскіраваныя кулямётныя гнёзды; на верхавінах дрэў хаваліся снайперы, — атрымвавалася лінія фронту ў лясной вайне, з чым вермахт да той пары не сутыкаўся. Нямецкія сухапутныя войскі не маглі эфектыўна выкарыстоўваць артылерыю, танкі і авіяцыю, было немагчыма скарэкціраваць агонь.

Тады ў ход пайшла тактыка засад "зондэркаманд" лясной і егерснай службаў, калі дыспазыцыя войскаў змянялася, зыходзячы з абстаноўкі. Гэта была страшная гульня ў "коткі-мышкі", якая кожнаму, хто прайграў, каштавала жыцця. Абаронцы Пушчы пастаянна змянялі месца дыслакацыі і зноў, карыстаючыся перавагамі лесу, нападалі на ворага. Гітлераўцы ў адказ зноў і зноў прачэсвалі лясы, пакуль не знаходзілі савецкіх салдат. Сутычка пераходзіла ў бліжні бой — чалавек супраць чалавека, — і так паступова ў жорсткіх баях вораг праходзіў углыб Пушчы. Ахвярамі той нябачнай і малавядомай лясной вайны станавіліся і мясцовыя жыхары, якія выпадкова траплялі пад прыцэл фашыцкіх захопнікаў. "Лес быў поўны трупаў", — так казалі пра той час сведкі, якім удалося выжыць.

**Праз 40 гадоў**

На дадзены момант вядомы тры прозвішчы савецкіх герояў — абаронцаў Белавежскай пушчы, якія сталі сімвалам савецкага супраціўлення ў запаведніку: гэта Жакен Байсамбекаў, Акцюбакбар Махмудаў і Ілля Ганчароў. Тры кулямётчыкі 49-й стралковай дывізіі 333-га папка на цылыя суткі спынілі рух грузавых машын на адрэзку парой Камянюкі — Белавежа. Змагары прынялі бой супраць значных сіл праціўніка 27 чэрвеня 1941 года. Падбіўшы нямала варожай тэхнікі і знішчожыўшы каля двух дзесяткаў гітлераўскіх салдат, яны спынілі прасоўванне нямецкіх войскаў. Няхай толькі на адной дарозе. І няхай толькі на суткі.

Двое з Траіх загінулі, адзін быў цяжка паранены, але выжыў, дзякуючы дапамозе мясцовых жыхароў. Старажылы кажуць, што хтосьці з вяскоўцаў пасля бою схаваў Іллю Ганчарова — а гэта быў ён — на сваім хутары. Тое, што баец застаўся ў жывых, дало магчымасць данесці гісторыю подзвігу нашчадкам. На жаль, далейшы лёс кулямётчыка застаўся невядомым.

Цікава, што і імёны адважных абаронцаў удалося ўстанавіць толькі праз 40 гадоў пасля заканчэння вайны, дзякуючы крапатліваму пошуку "чырвоных следапытаў". Але адразу ж пасля вайны безыменным героям устанавілі помнікі: на тым месцы, дзе кулямётны разлік прыняў няроўны бой, — абеліск, у выглядзе чырвонай зоркі, і ля ўвахода ў Нацыянальны парк — скульптура кулямётчыка на гранітным пастаменце.

Апошні мемарыял неаднойчы рэканструяваўся ў мінулым стагодзі. Сёлета ж, у год 600-годдзя запаведнага рэжыму, помнік праходзіць новы этап рэканструкцыі з мэтай усталявання гістарычнай справядлівасці: на ім павінны застацца імёны герояў. Таксама важным пытаннем застаецца і месца размяшчэння мемарыяла; ля галоўнага ўвахода або ў спакойным ландшафце, у атачэнні дубоў і ясеняў, якія, неаспрэчна, ведаюць пра тыя падзеі больш, чым мы. Бо вайна пакінула пасля сабе "помнікі" рознага каштунку: не ўсе кулі, якія выпусцілі фашысты ў мірных жыхароў і абаронцаў Пушчы, дасягнулі мэты. Многія з іх заселі ў ствалах дрэў, камусьці, магчыма, выратаваўшы жыццё. І як тады не далучыць да абаронцаў сваей зямлі гэтыя магутныя дубы, урачыстыя грабы ці трапяткія бярозкі? І схіліцца перад імі ў паклоне...

***

Апошні жорсткі бой з прымяненнем цяжкай артылерыі і танкаў адбыўся на ўсходняй ускраіне Пушчы. Невялікае падраздзяленне савецкай арміі трымалася да апошняга ля вёскі Палелава ў "абароне" дрыгвы і каналаў...

(Працяг будзе.)

***Д.Амяльковіч***

**Источник:** Культура.-2009.-3-9 кастр.-С.15.-(працяг будзе).